РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

26 ВЕРАСНЯ 2025 г. ПЯТНІЦА № 186 (30574)

# «НАМ ТРЭБА ПРАЦЯГВАЦЬ ПРАЦАВАЦЬ ПА МНОГІХ КІРУНКАХ»




## На Глабальным атамным форуме Аляксандр Лукашэнка анансаваў магчымае будаўніцтва яшчэ адной атамнай станцыі

Першы дзень рабочага візіту Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Расію выдаўся насычаным. Па традыцыі такіх камандзіровак беларускі лідар разглядае мноства пытанняў па розных тэмах. У прэзідэнцкім графіку — удзел у Глабальным атамным форуме, двухбаковыя сустрэчы і перагаворы.

СТАР. 2–3

КАМУНАЛЬНЫЯ СТАСУНКІ

## КАЛІ «АДТАЮЦЬ» БАТАРЭІ?

### Аб'екты да ацяпляльнага сезона гатовыя

Ужо традыцыйна напрыканцы верасня або ў пачатку кастрычніка падключаюць ацяпленне. Сёлета холад прыйшоў досыць рэзка. Ці паспелі падрыхтавацца камунальнікі?

### З ПАПРАЎКАЙ НА НАДВОР'Е

Як адзначыла **начальнік вытворчага аддзела ГА «Мінская гарадская жыллёва-камунальная гаспадарка» Наталля ВАЙЦЯХОВІЧ**, рашэнне аб падачы цяпла ў аб'екты сацыяльнай сферы, жылыя дамы і адміністрацыйныя будынкі прымаецца мясцовымі ўладамі зыходзячы з умоў надвор'я. Гэтак жа, як і ў мінулыя гады, у сацыяльных аб'ектах батарэі «адтаюць», калі трое сутак запар усталюецца сярэднясутачная тэмпература плюс 10 градусаў і ніжэй. У адпаведнасці з нарматыўнымі дакументамі, ацяпляльны сезон у жыллёвым фондзе стартуе тады, калі сярэднясутачная тэмпература паветра на працягу трох сутак не перавысіць 8 градусаў. Кожны рэгіён краіны падключаецца да цяпла згодна з мясцовымі кліматычнымі ўмовамі.

Напрыклад, Наталля Вайцяховіч удакладніла, што летась ацяпляльны сезон у Мінску пачаўся 4 кастрычніка. А вось раней за ўсё ацяпленне ў жыллёвы фонд у сталіцы стала паступаць у 2021 годзе — 22 верасня, пазней за ўсё — у 2020-м — 13 кастрычніка. Яна таксама адзначыла, што летась ацяпляльны сезон аказаўся самым кароткім — 196 дзён. Напрыклад, у 2021 годзе ён доўжыўся 231 дзень, у 2020-м — 221 дзень.



СТАР. 8–9




ІНАПРАМ РЫХТУЕЦЦА ДА АДКРЫЦЦЯ 6



ШТО ЗАКЛАДУЦЬ У СТАБФОНДЫ? 8–9




ПЕРШЫ СЕРЫЯЛ «ПАКАЛЕННЯ Z» 11



+TV ПРАГРАМА

«ТРОЕ Ў ЛОДЦЫ, КАЛІ НЕ ЛІЧЫЦЬ САБАКУ»

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале

**@zviazdaby.**

Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

TikTok

ISSN 1990 — 763X

25186>

# «НАМ ТРЭБА ПРАЦЯГВАЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ключавой падзеяй у прэзідэнцкім графіку на чацвер стаў удзел у Глабальным атамным форуме, які праходзіць на тэрыторыі ВДНГ. Міжнародны форум «Сусветны атамны тыдзень» праводзіцца ўпершыню і прымеркаваны да 80-годдзя атамнай прамысловасці Расіі. Месца правядзення абрана невыпадкова — музей «Атам» на ВДНГ, дзе прадстаўлена найбуйнейшая і самая сучасная ў Расіі экспазіцыя, прысвечаная ядзернай энергіі. Яна паказвае гісторыю асваення атамнай энергіі ад пачатку Савецкага атамнага праекта і да нашых дзён. Перад пленарным пасяджэннем форуму разам з гасцямі Аляксандр Лукашэнка агледзеў экспазіцыю — экскурсію правёў генеральны дырэктар расійскай дзяржкарпарацыі «Расатам» Аляксей Ліхачоў. У Глабальным атамным форуме бяруць удзел прадстаўнікі больш як ста дзяржаў, уключаючы краіны СНД, Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі. Праграма форуму сабрала вядомых атамшчыкаў, навукоўцаў, прадстаўнікоў дзяржорганаў, міжнародных арганізацый, буйных кампаній.



Фота БелТА.

## «У СКЛАДАНЫЯ ЧАСЫ РАСІЯ АДКРЫЛА САМУЮ САКРЭТНУЮ СФЕРУ»

У сваім выступленні на форуме Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў значэнне гэтага мерапрыемства. «Вы ведаеце, у якой сітуацыі знаходзіцца Расія і мы ў тым ліку разам з Расійскай Федэрацыяй. Што толькі аб нас сёння не пішуць, не кажуць, абзываюць нас рознымі словамі — і агрэсары, і мы суагрэсары, і гэтак далей...

**Што там утойваць: у Расіі, як і ў іншых краінах, якія тут прысутнічаюць, праблем хапае. Шмат пытанняў, шмат праблем і шмат барацьбы, якую ацэняць у будучыні, я ў гэтым проста перакананы. Але, тым не менш, мы што, гаворым сёння пра вайну, гаворым пра ваенныя праблемы? Не. А з падачы той жа Расіі, у якой нямала праблем, мы гаворым аб мірным атаме. Мы сабраліся на форуме, дзе Расія дзеліцца сваім досведам. Назавіце яшчэ іншыя краіны, якія валодаюць падобнымі тэхналогіямі, якія б так адкрыта, шчыра заявілі: «Прыходзьце і глядзіце!» Самыя перадавыя тэхналогіі, тэхналогіі, якімі ў адкрытую не дзеляцца.**

Вось так, у адкрытую ў складаныя часы заявілі: «Прыходзьце, мы будзем з вамі супрацоўнічаць». У Расіі сёння няма сакрэтаў у самай сакрэтнай галіне», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён заўважыў, што гэта не камплімент сябрам, а канстатацыя рэальнага факта: у складаныя часы Расія адкрыла самую сакрэтную сферу. І самы красамоўны прыклад гэтаму — Беларусь.

Атамных станцый пабудавана шмат, і яшчэ столькі ж будзе пабудавана. «Але каб прыйсці ў іншую краіну і сказаць: «Мы вам пабудуем, вось вам крэдыт. Мы вам пабудуем самую сучасную станцыю, ды яшчэ з вашымі будаўнікамі. Дзякуй Прэзідэнту (Уладзіміру Пуціну. — **«Зв.»**), ён сказаў: «Мы навучым вас будаваць атамныя станцыі, і вы разам з намі станеце будаваць атамныя станцыі па ўсім свеце».

**І мы разам стварылі атамную станцыю, рэалізаваўшы самы прасунуты праект. Мы стварылі самую сучасную, прыгожую (я гэтым ганаруся) атамную станцыю», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.**

Прэзідэнт падзякаваў кіраўніцтву Расіі і кіраўніцтву «Расатама» за рэалізацыю гэтага праекта. Аляксандр Лукашэнка заявіў аб планах дамовіцца з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным аб будаўніцтве ў Беларусі другой АЭС. Больш дэталёва Прэзідэнты абмяркуюць гэта пытанне падчас двухбаковай сустрэчы, запланаванай на пятніцу.

**«У нас няма пытанняў, хто будзе будаваць гэтую станцыю. Мы будзем яе будаваць разам з расіянамі, таму што яны навучылі нас гэта рабіць. І ўжо мы па просьбе «Расатама» дзе-нідзе ў асобных дзяржавах удзельнічаем у будаўніцтве падобных станцый», — заявіў кіраўнік дзяржавы.**

Па яго словах, тое, што робіць Расія ў галіне будаўніцтва атамных станцый, — непадуладна ніякай іншай краіне.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Уладзіміру Пуціну за тое, што ў Беларусі пабудавалі АЭС і беларускія спецыялісты атрымалі адпаведны вопыт. «Дзякуй за навуку, дзякуй, што вы зрабілі нашу краіну па-сапраўднаму ядзернай дзяржавай. Не шкадуючы ніякіх сакрэтаў, выконваючы міжнароднае права, прынцыпы. Гатовыя дзейнічаць і далей не толькі ў Беларусі, але і на міжнароднай арэне, дапамагаючы будаваць станцыі, — адзначыў беларускі лідар. — Мы ўмеем ужо рабіць усё. Мы не можам

## АБ ЧЫМ АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА РАЗМАЎЛЯЎ

Своеасаблівай традыцыяй візітаў беларускага лідара ў Расію стала размова з расійскімі журналістамі. Ім заўжды цікавы наш Прэзідэнт, а Аляксандр Лукашэнка, як вядома, заўсёды адкрыты да дыялогу. Гэты раз не стаў выключэннем. На палях Глабальнага атамнага форуму журналісты задалі некалькі пытанняў беларускаму лідару.

**?** ***Прадстаўнікі СМІ пацікавіліся, ці будзе ён перадаваць нейкае паведамленне ад прадстаўнікоў ЗША свайму расійскаму калегу падчас асабістай сустрэчы.***

«Я яму заўтра перадам усе вестачкі і паведамленні. Тым больш гэта такі вялікі блок для абмеркавання нашых пытанняў агульных. Там мы абмяркуем прапановы некаторыя», — расказаў Аляксандр Лукашэнка. У цэлым, па яго словах, назапасілася шмат пытанняў для абмеркавання з Прэзідэнтам Расіі.

**?** ***Журналісты таксама папрасілі ацаніць прапанову Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна па далейшым лёсе Дагавора па скарачэнні стратэгічных наступальных узбраенняў.***

«Бліскучая ініцыятыва», — адказаў на гэта Аляксандр Лукашэнка. Ён звярнуў увагу на паслядоўную палітыку Расіі і правёў паралель з тэматыкай форуму, дзе гаворка ішла пра развіццё атамнай энергетыкі, і ў тым ліку пра гатоўнасць Расіі дзяліцца сваімі перадавымі тэхналогіямі ў гэтай сферы. «Я сёння казаў пра атам. Усе нас дзяўбуць: і агрэсары, і суагрэсары, і мы такія-сякія... А мы, перш за ўсё Расійская Федэрацыя, прапануем свету: вось мірны атам, давайце развівацца, вось вам мірныя тэхналогіі — бярыце», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Тое ж самае, па яго словах, датычыцца дагавора па скарачэнні стратэгічных наступальных узбраенняў. «Колькі б мы тут ні целяпаліся пра розныя канфлікты (гэта дрэнна, людзі гінуць і гэтак далей), але не дай бог мы не вырашым праблему, пра якую вы сказалі, — быць бядзе. І Расія ў гэты момант працягвае руку ўсім: давайце дамаўляцца. Не можаце сёння — давайце на год працягнем дагавор і дамовімся. Таму я з вялікім задавальненнем пачуў гэтую прапанову Уладзіміра Уладзіміравіча і абсалютна яго падтрымаў. Гэта адсоўвае глабальную вайну», — растлумачыў сваю пазіцыю Аляксандр Лукашэнка.

**?** ***Журналісты заўважылі, што гэтую прапанову варта было б падтрымаць і амерыканцам.***

Беларускі лідар паабяцаў перадаць гэта Дональду Трампу. «Як бунтар і рэвалюцыянер ён адназначна пад-

# ПРАЦАВАЦЬ ПА МНОГІХ КІРУНКАХ»

толькі рэактар зварыць, зрабіць яго. Гэта ўжо вашы кампетэнцыі. І не трэба (рабіць гэта ў Беларусі). Усё астатняе мы ўжо навучыліся рабіць. Гатовыя рэалізоўваць ва ўсіх краінах-партнёрах і тых, хто яшчэ думае, якую станцыю пабудаваць. Мы гатовыя ў гэтым удзельнічаць. Якасць, ужо магу сказаць з расіянамі разам, мы гарантуем».

«Так, Нікол Ваваевіч, калі трэба, звяртайцеся. Калі Прэзідэнт (Расіі. — **«Зв.»**) ухваліць, мы гатовыя прыступаць», — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да прэм'ер-міністра Арменіі Нікола Пашыняна, які прысутнічаў на форуме.

Асобна Прэзідэнт папрасіў Расійскую дзяржкарпарацыю «Расатам» не сыходзіць з Беларусі і прапанаваў аднавіць рух па наяўным у краіне ядзерным цэнтры. Звяртаючыся да кіраўніка «Расатама», беларускі лідар адзначыў: «Думаю, я змагу пераканаць Прэзідэнта Расіі ў тым, што ў Беларусі трэба працягваць працаваць. І не толькі ў плане рэалізацыі нашых з вамі задумак з часоў Сяргея Кірыенкі (былога кіраўніка «Расатама». — **«Зв.»**). Нам трэба працягваць працаваць па многіх кірунках. Мірных і перш за ўсё ў галіне аховы здароўя», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка выказаў спадзяванне, што Уладзімір Пуцін ухваліць і прапанову аднавіць рух па ядзерным цэнтры ў Беларусі. «Я яго захаваў, якім ён мне дастаўся з савецкіх часоў. Там пад кантролем Гросі (кіраўніка МАГАТЭ. — **«Зв.»**) знаходзіцца нямала добрых матэрыялаў. Вы ведаеце: мы свята дамоўленасці свае выконваем», — дадаў ён.

## ГРОСІ ЗРАБІЎ ВЕЛІЗАРНУЮ СПРАВУ

Асобна Прэзідэнт падзякаваў кіраўніку МАГАТЭ Рафаэлю Гросі за яго пазіцыю па беларускай АЭС. «Хачу вам, спадар Гросі, падзякаваць за тое, што вы былі сапраўдным мужыком, сапраўдным чалавекам. Наша станцыя, вы памятаеце, была сур'ёзна палітызаваная. І не там будуем, і не тое будуем, і амерыканцы супраць, а еўрапейцы наогул былі ў шаленстве. Вы шмат разоў бывалі на гэтай станцыі. Але вы ў адкрытую перад журналістамі казалі: «Не нападайце на Беларусь, яны будуюць з расіянамі самую прасунутую станцыю, пытанняў няма», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён падкрэсліў, што Рафаэль Гросі зрабіў велізарную справу. «Вы ніколі не падстаўлялі нас з расіянамі, не прымушалі нас апраўдвацца. Вы былі шчырым і прыстойным чалавекам. Дзякуй вам вялікі за ўсё тое, што вы зрабілі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы таксама выказаўся з адабрэннем меркавання аб тым, што калі Рафаэль Гросі захацеў бы стаць кіраўніком у ААН, то можна падтрымаць яго кандыдатуру.

# ДАВЕСЦІ ТАВАРААБАРОТ ДА СУР'ЁЗНЫХ АБ'ЁМАЎ

### Аляксандр Лукашэнка прапанаваў прэм'ер-міністру Эфіопіі да канца бягучага года стварыць план — дарожную карту супрацоўніцтва дзвюх краін

Першую двухбаковую сустрэчу ў Маскве Аляксандр Лукашэнка правёў з прэм'ер-міністрам Эфіопіі Абіем Ахмедам Алі. Эфіопія для Беларусі – партнёр даўні і надзейны. Гэта адна з самых населеных краін свету. Там пражывае больш за 132 мільёны чалавек, па гэтым паказчыку Эфіопія займае другое месца сярод краін Афрыкі. Такі велізарны рынак сёння мае вялікую патрэбу ў тэхніцы, у прадуктах харчавання, у сучасных тэхналогіях. Эфіопія з'яўляецца членам Афрыканскага саюза, які аб'ядноўвае 55 дзяржаў кантынента. Штаб-кватэра гэтага аб'яднання знаходзіцца ў сталіцы Эфіопіі Адыс-Абебе. Па сутнасці, Эфіопія з'яўляецца для Беларусі варотамі ў Афрыку, таму кіраўнік дзяржавы ўдзяляе столькі асабістай увагі супрацоўніцтву з гэтай краінай, бо бачыць перспектывы.


Фота БелТА.

Аляксандр Лукашэнка і Абій Ахмед Алі сустракаліся летась у кастрычніку на саміце БРІКС у Казані і тады намецілі кірункі супрацоўніцтва. Таму ў Маскве, як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, ёсць пра што пагаварыць. «Тым больш дамовіцца пра будучыню. У нас выбудоўваецца надзвычай нядрэнны парадак нашых узаемаадносін. Мы пазначылі тыя кірункі, па якіх можам і павінны супрацоўнічаць. Мы ведаем, у чым мае патрэбу Эфіопія, — тое, што ёсць у нас. Добра ведаем, у чым маем патрэбу мы, і гэта ёсць у Эфіопіі. Трэба нам паглыбляцца, даводзіць тавараабарот да сур'ёзных аб'ёмаў, таму што нашы эканомікі на гэта здольныя, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён зрабіў акцэнт на тым, што ў плане гандлёва-эканамічных адносін паміж Беларуссю і Эфіопіяй няма закрытых тэм, нашы краіны могуць супрацоўнічаць па ўсіх кірунках: сельская гаспадарка, стварэнне сумесных прадпрыемстваў у Эфіопіі, вытворчасць прадуктаў харчавання, ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва. «Усё, што мы можам, — мы гатовыя з вамі па гэтых кірунках працаваць», — запэўніў беларускі лідар.

Ён прапанаваў да канца бягучага года стварыць план — дарожную карту супрацоўніцтва Беларусі і Эфіопіі. «Прапісаць не толькі кірункі, але і канкрэтныя лічбы, на якія мы павінны выйсці, пачынаючы ад агульнага тавараабароту да пастаўкі нашага абсталявання, тэхнікі ў штуках. І наадварот — пастаўкі Эфіопіі ў Беларусь», — удакладніў кіраўнік дзяржавы. Ён запэўніў, што МЗС Беларусі гатова аператыўна ажыццявіць гэту работу па выпрацоўцы плана дзеянняў на найбліжэйшыя гады. Пра неабходнасць падпісання дарожнай карты і яшчэ больш плённага развіцця па ўсіх кірунках Прэзідэнт гаварыў напачатку верасня, прымаючы даверчую грамату ад пасла Эфіопіі ў Беларусі Генета Тэшоме Жыру.

Аляксандр Лукашэнка запрасіў прэм'ер-міністра Эфіопіі ў Беларусь, каб паглядзець на прадпрыемствы і кірункі, якія цікавяць. «Мы нічога ад вас хаваць не будзем», — адзначыў Прэзідэнт.

У сваю чаргу Абій Ахмед Алі адказаў: «Мы хацелі б нарасціць узаемадзеянне ў гандлі і эканоміцы. Ёсць шэраг кірункаў, па якіх мы можам працаваць разам. Адзін з такіх сектараў — сельская гаспадарка. Мы ведаем, што ў Беларусі ёсць добрая вытворчасць трактароў. І сумесная вытворчасць можа быць разлічана не толькі на Эфіопію, але і на ўвесь Усход Афрыкі». Іншым важным кірункам прэм'ер-міністр назваў будаўніцтва. Эфіопія гатовая да сумеснай вытворчасці абсталявання ў гэтай сферы і таксама з прыцэлам на рынкі трэціх краін.

«Мы таксама добра ведаем аб вашых магчымасцях у ваенна-тэхнічным супрацоўніцтве, той падтрымцы, якую вы можаце аказаць для нашай краіны», — дадаў Абій Ахмед Алі.

## З ЖУРНАЛІСТАМІ

трымае гэтую ініцыятыву. І потым, у Трампа вялікая сям'я, і, што мне падабаецца, ён любіць сям'ю, цэніць сям'ю, любіць дзяцей і ведае, да чаго можа прывесці глабальнае сутыкненне і вайна», — адзначыў ён. Тым больш, звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, амерыканскі лідар ужо спыніў некалькі канфліктаў. «Ён робіць усё, каб гэтай вайны не было. Калі ён шчыры ў гэтым памкненні, то абавязкова падтрымае гэтую ініцыятыву. Я чамусьці ўпэўнены, што падтрымае», — падзяліўся меркаваннем Прэзідэнт.

**?** ***Яшчэ адно пытанне датычылася «Арэшніка».***

Журналісты ўдакладнілі, ці даехаў ён да Беларусі. «Ужо ў дарозе. Усё будзе нармальна», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

**Паводле БелТА і Прэс-службы Прэзідэнта.**

## Прэзідэнт заслухаў даклад пасла Беларусі ў Расіі

Удзелам у Глабальным атамным форуме работа Прэзідэнта ў Маскве ў чацвер не скончылася. Адразу пасля пасяджэння кіраўнік дзяржавы прыняў з дакладам пасла Беларусі ў Расіі Аляксандра Рагожніка.

Найперш беларускі лідар падкрэсліў, што трэба ўзмацняцца па экспарце ў Расію прамысловай прадукцыі. «Сітуацыя ў Расійскай Федэрацыі, асабліва што тычыцца рынкаў збыту... Ведаеш, што пачынае прасядаць трохі прамысловасць. Хоць у цэбе аптымізм у гэтым плане. Калі сапраўды у нас пайшлі продажы па лёгкай прамысловасці, па іншых напрамках, нават «белая прамысловасць» — халадзільнікі, пральныя машыны... Ёсць добрыя напрацоўкі і дзеянні. Гэта вельмі добра, выдатна. Вядома, трэба ўзмацняцца. Гэта пытанне нумар адзін. Таму што па экспарце мы не дапрацоўваем вельмі моцна», — заявіў Прэзідэнт. Ён папрасіў пасла прадставіць свой пункт гледжання, улічваючы папярэдні вопыт работы на пасадзе міністра прамысловасці.

Напярэдадні перагавораў з Прэзідэнтам Расіі, якія запланаваны на пятніцу, Аляксандр Лукашэнка спытаў, якія ў нас ёсць праблемы ў Расійскай Федэрацыі. «Накont нашых перагавораў, магчыма, ёсць нейкія пытанні. І ўраджанні па нафце, па газе і гэтак далей. Па адзіным рынку, як ён развіваецца, — тое, што мы задумвалі. І тыя пытанні, якія ты хацеў пазначыць», — акрэсліў кола пытанняў беларускі лідар.

Як адзначаў Аляксандр Рагожнік у размове з журналістамі, двухбаковы парадак дня сустрэч беларускага і расійскага лідараў заўсёды насычаны. «Гэта, безумоўна, абарона ўнутранага рынку ў рамках Саюзнай дзяржавы. Гэта і адзіная прамысловая палітыка, пытанні ў нафтагазавым сектары. Прэзідэнтам заўсёды ёсць што абмеркаваць. Трэба адзначыць, што невырашальных праблем з Расійскай Федэрацыяй сёння не існуе», — падкрэсліў пасол.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ОАО «Н Холдинг» проводит открытый повторный аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности ОАО «МПОВТ»**

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

**ЛОТ № 1**

Капитальное строение с инв. № 600/С-183764, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/33, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 161,9 кв. м. Наименование: Хоздвор «Колодищи». Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: 33А1/к-Хоздвор «Колодищи», а-Ворота въездные НПР-1128 (инв. № 32258), б-Ограждение (инв. № 980953), в-Ограждение (инв. № 980954).
Капитальное строение с инв. № 600/С-182231, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/26, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 11,8 кв. м. Наименование: Помещение ВОХР (проходная № 2) (инв. № 32954). Назначение: Здание проходной (в том числе контрольно-пропускного пункта). Составные части и принадлежности: 26А1/к-Помещение ВОХР (проходная № 2) (инв. № 32954). Обременение: аренда.
Капитальное строение с инв. № 600/С-182241, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/25, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 73,6 кв. м. Наименование: Склад 65 кв. м (инв. № 50186). Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: 25А1/м-Склад 65 кв. м (инв. № 50186). Обременение: аренда.
Капитальное строение с инв. № 600/С-151683, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/3, район аг. Колодищи. Площадь: 83,2 кв. м. Наименование: Административно-бытовое здание. Назначение: Здание административно-хозяйственное. Составные части и принадлежности: Одноэтажное смешанной конструкции административно-бытовое здание с крыльцами. Обременение: аренда.
Капитальное строение с инв. № 600/С-183139, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/30, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 11,6 кв. м. Наименование: Склад. Назначение: Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: 30А1/к-Склад.
Капитальное строение с инв. № 600/С-182228, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Колодищанский с/с, 17/27, вблизи аг. Колодищи. Площадь: 8,5 кв. м. Наименование: Туалет на 2 очка № 3 (инв. № 32946). Назначение: Здание санитарно-бытового назначения. Составные части и принадлежности: 27А1/к-Туалет на 2 очка № 3 (инв. № 32946).
Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 623683400001000692, площадью 9,7659 га, предоставленном ОАО «МПОВТ» на праве постоянного пользования (срок действия: не установлен).
На земельном участке установлены следующие ограничения (обременения): зона санитарной охраны источников артскважина № 32265/78, площадь 9,7659 га

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **367 000,00** | **Задаток, BYN** | **36 700,00** | **Шаг аукциона** | **5 %** |

| | |
|---|---|
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «МПОВТ»<br>Республика Беларусь,<br>220140, г. Минск, ул. Притыцкого, д. 62<br>Тел. +375 (17) 388 90 99<br>E-mail: mpovt@mpovt.by |
| **Сведения об организаторе аукциона** | ОАО «Н Холдинг»<br>220029, г. Минск, пр-т Машерова, 11, пом. 1.<br>Тел. 8 029 754 63 46 (Мария) |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также в течение 3 (трех) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 3 % от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (не резидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) не позднее дня подачи заявления на участие в аукционе на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр-т Независимости, 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240 ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 08 октября 2025 включительно** в рабочие дни с 9.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Аукцион состоится **09 октября 2025 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг» |

Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время, без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от проведения аукциона


ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# «ВЫНІК НАШАЙ ПРАЦЫ — ГЭТА АЦЭНКА ГРАМАДЗЯН»

## Жыллёва-камунальнае абслугоўванне як маркер эфектыўнасці мясцовай улады

У Наваполацку пад кіраўніцтвам Наталлі КАЧАНАВАЙ прайшло пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага кіравання і самакіравання. Тэма абмеркавання — меры па паляпшэнні якасці жыллёва-камунальнага абслугоўвання насельніцтва, удасканаленні падыходаў і механізмаў іх аказання.




Як адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі, пытанні жыллёва-камунальнай гаспадаркі займаюць прыярытэтнае месца ў зваротах, што паступаюць ад грамадзян у Савет Рэспублікі. Статыстыка па такіх зваротах пераважае і ў іншых дзяржаўных органах. «Сярод усіх зваротаў, якія паступілі да нас, 24 % — гэта пытанні, якія тычацца работы прадпрыемстваў жыллёва-камунальнай гаспадаркі і аказання імі паслуг насельніцтву. Таму мы вынеслі гэта пытанне, каб падзяліцца вопытам, які ёсць у розных рэгіёнах нашай краіны», — зазначыла Наталля Качанава.

Спікер падкрэсліла, што структура работы прадпрыемстваў у розных галінах розная. Аднак маркер эфектыўнасці дзейнасці адзін — гэта ацэнка грамадзян, якая перш за ўсё залежыць ад таго, як працуюць структуры жыллёва-камунальнай гаспадаркі ў цэлым: «Людзі менавіта па гэтым вызначаюць для сябе меркаванне аб уладзе. Калі цёпла, чыста, добраўпарадкавана, светла — людзі кажуць: улада працуе добра. А калі ўзнікаюць нейкія пытанні, то мы дакладна ведаем, што людзі будуць незадаволеныя і дадуць адпаведную ацэнку органам улады».



Таксама Наталля Качанава нагадала, што гэты год аб'яўлены Годам добраўпарадкавання і менавіта да дзейнасці ЖКГ прыкавана асаблівая ўвага: «Прадпрыемствы, якія працуюць у галіне, што ахоплівае практычна ўсе сферы жыццядзейнасці, вядома, павінны бачыць, чуць людзей і, зыходзячы з гэтага, прымаць рашэнні, якія будуць даваць вынік у рабоце».

У працяг тэмы Старшыня Савета Рэспублікі засяродзіла ўвагу на значнасці дзейнасці па перапрацоўцы адходаў, падкрэсліўшы, што гэта — задача ад кіраўніка дзяржавы. У гэтай сувязі яна станоўча адзначыла работу біямехзавода ў Наваполацку: «Работа з адходамі тут ужо даўно была выбудавана дастаткова нядрэнна. Сёння вы бачылі абсалютна новы комплекс (Наваполацкі рэгіянальны комплекс па абыходжанні з ЦКА.— **Заўв. «Зв.»**), які пачне дзейнічаць у бліжэйшы час. Але самае галоўнае, што тут будзе ажыццяўляцца не толькі збор і перапрацоўка адходаў, але і наладзяць частковую вытворчасць прадукцыі з другасных рэсурсаў, што прынясе прыбытак прадпрыемству і вырашыць задачу».

Вяртаючыся да тэмы прыёмаў грамадзян, Наталля Качанава падзялілася, што па выніках аднаго з іх, які адбыўся нядаўна, яна прыйшла да некаторых высноў аб рабоце мясцовай улады. Так, напрыклад у Капылі мясцовыя органы кіравання функцыянуюць дастаткова эфектыўна. «Калі людзі гавораць, што ў нас добра, прыгожа, чыста, добраўпарадкавана, то разумееш, што ўлада на месцах сапраўды робіць усё для таго, каб вырашаць задачы, якія будуць на карысць нашых людзей», — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі і акцэнтавала ўвагу на тым, што вынікі працы мясцовай улады заўсёды на паверхні.

**Міністр ЖКГ Генадзь ТРУБІЛА** расказаў, што ў галіне працуюць больш як 110 тыс. чалавек. Ён падкрэсліў, што за мінулы год ЖКГ краіны спрацавала з прыбыткам і стратных арганізацый у сістэме няма. З 2022 года па дзяржпраграме 99,4 % насельніцтва забяспечана чыстай вадой, у тым ліку ў сельскай мясцовасці за кошт будаўніцтва станцый абезжалезвання. На будучую пяцігодку, паводле слоў міністра, стаіць задача пачаць планамерна рэканструяваць тыя станцыі, якія былі ўведзены ў строй раней.

Адна з надзённых праблем, якія абмяркоўваліся на Савеце — капрамонт жылфонду, асабліва гэта датычыцца старых забудоў, дамоў у два—пяць паверхаў, дзе можа нават адсутнічаць водапровод. Кошт такіх работ часам перавышае выдаткі на будаўніцтва новага дома. Наталля Качанава адзначыла, што гэтае пытанне трэба разглядзець комплексна, падключыўшы Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва.

Таксама ўдзельнікі пасяджэння ўзнялі пытанні дзейнасці адзінай службы 115. Нараканні на яе ад насельніцтва працягваюць паступаць. Генадзь Трубіла падкрэсліў, што служба будзе далей развівацца. Старшыня Савета Рэспублікі даручыла глыбей прааналізаваць, як выконваюцца заяўкі, якія паступаюць на гэты нумар, і павысіць аператыўнасць вырашэння пытанняў насельніцтва.

Уладкаванне пешаходных сувязяў у гарадах, праблема смеццеправодаў, забеспячэнне гарачай вадой належнай тэмпературы, добраўпарадкаванне дваровых тэрыторый, а таксама гатоўнасць сістэмы ЖКГ прыняць на баланс арэнднае жыллё, у прыватнасці ў Віцебскай вобласці, — такія пытанні абмеркавалі на пасяджэнні мясцовых парламентарыяў дэпутаты.

Наталля Качанава падкрэсліла, што ў Беларусі шмат робіцца для паляпшэння работы сістэмы ЖКГ, таму што гэта асаблівы паказчык у рабоце мясцовых органаў улады і ў цэлым краіны. Яна адзначыла, што больш за палову зваротаў у Савет Рэспублікі па тэматыцы ЖКГ датычыцца пытанняў абслугоўвання і стану жыллёвага фонду. «У гэтым сегменце 60 % пытанняў датычацца абслугоўвання, бягучага ўтрымання жыллёвага фонду, капітальнага рамонту, таму мы прыйшлі да высновы, што павінны на Савеце па ўзаемадзеянні з мясцовымі органамі самакіравання разгледзець менавіта пытанне эфектыўнай работы прадпрыемстваў ЖКГ, а таксама як вырашаюцца тыя пытанні, якія ўзнікаюць у нашых грамадзян», — расказала журналістам Старшыня Савета Рэспублікі.

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі і БелТА.**
**Фота БелТА.**

### У тэму

### Перапрацоўка і абясшкоджванне

Да пачатку пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага кіравання і самакіравання Наталля Качанава наведала пляцоўку Наваполацкага рэгіянальнага комплексу па абыходжанні з ЦКА. Увод у эксплуатацыю яго першай чаргі намечаны на лістапад.

У Віцебскай вобласці гэты комплекс стане трэцім па абыходжанні з ЦКА. З уводам яго ў эксплуатацыю праз сартаванне будзе праходзіць да 75 % адходаў рэгіёну. Пры гэтым Наваполацкі комплекс — адзіны з дзеючых у вобласці, дзе будуць утылізавацца медыцынскія адходы.

На новым комплексе штогод будзе сартавацца да 80 тысяч тон смецця. Праектныя магутнасці дазволяць абясшкоджваць, спальваючы пры высокіх тэмпературах, да 700 тон у год медыцынскіх і біялагічных адходаў.

# АБ'ЕКТЫЎНЫ ПОГЛЯД НА ГІСТОРЫЮ, АКТУАЛЬНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ І МІЖНАРОДНЫЯ ПРАЕКТЫ

## Шырокае кола пытанняў абмеркавалі на пасяджэнні Рэспубліканскага савета па гістарычнай палітыцы пры Адміністрацыі Прэзідэнта



Фота БелТА.

Найперш у цэнтры ўвагі ўдзельнікаў пасяджэння знаходзіліся задачы, пастаўленыя кіраўніком дзяржавы падчас вялікай размовы з ідэалагічным актывам, гістарычнай і экспертнай супольнасцю, якая адбылася ў Дзень народнага адзінства ў Палацы Незалежнасці. Сярод іх — аб'ектыўнае адлюстраванне гістарычных падзей, фарміраванне пантэона нацыянальных герояў. Акрамя таго, ішла размова аб рэалізацыі Канцэпцыі школьнай гістарычнай адукацыі і ўкараненні цыкла сацыяльна-гуманітарных дысцыплін у ВНУ, актуальнасці дысертацыйных даследаванняў і каардынацыі тэм з профільнымі інстытутамі НАН Беларусі. Абмяркоўвалася супрацоўніцтва з іншымі краінамі па пытанні захавання гістарычнай памяці.

### ПРАЎДЗІВАЯ ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ І ПАНТЭОН НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ГЕРОЯЎ

Як звярнуў увагу **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта, старшыня Рэспубліканскага савета па гістарычнай палітыцы пры Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый КРУТОЙ**, у сваім выступленні 17 верасня Аляксандр Лукашэнка прысвяціў вялікі блок аб'ектыўнаму адлюстраванню гістарычнага развіцця нашай краіны. «Беларускі лідар папрасіў нас нічога не перабольшваць, нічога не рэтушыраваць, а максімальна аб'ектыўна паказваць любую гістарычную падзею, якая адбывалася ў Беларусі, на аснове архіўных, статыстычных і фактурных матэрыялаў, экспертных даследаванняў і заключэнняў. Гэта вельмі важна з пункту гледжання сучаснай падачы ў школьных падручніках, метадычных дапаможніках, дысертацыйных работах, інфармацыі для турыстычных гідаў, улічваючы вялізную цікавасць і ўсплёск унутранага турызму ў Беларусі».

У якасці добрага прыкладу такой работы Прэзідэнт прывёў падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Але і тут, па словах кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, яшчэ вялікі пласт работы, якая вядзецца ў тым ліку ў рамках расследавання Генеральнай пракуратурай крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа. Дзмітрый Крутой падкрэсліў, што трэба змагацца за наш пункт гледжання, за нашу праўду і ў кантэксце адлюстравання іншых гістарычных падзей.

Прагучала падчас пасяджэння і тэма пантэона нацыянальных герояў. Прапанова аб фарміраванні такога пантэона паступіла ад кіраўніка дзяржавы 17 верасня. Што датычыцца падзей Вялікай Айчыннай вайны, нашы героі адлюстраваны нядрэнна. «Журналісты на працягу года падтрымліваюць у гарачым стане гэту тэму, — пацвердзіў Дзмітрый Крутой. — А вось аб героях, дапусцім, вызваленчага паходу Чырвонай Арміі 1939 года, гавораць менш. І так астатнія перыяды і эпохі».

Па словах кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, характарыстыка гэтага пантэона герояў павінна быць максімальна аб'ектыўнай: каб кожны беларус дакладна ўяўляў сваіх суайчыннікаў, якія ўнеслі ўклад не толькі ў развіццё Беларусі, але і, магчыма, у гістарычныя падзеі іншых краін.

### РАЗУМНАЕ ФІНАНСАВАННЕ І ПАТРЭБНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ

На пасяджэнні савета ішла размова і аб фінансаванні манументальных аб'ектаў Беларусі, якія ўяўляюць гісторыка-культурную каштоўнасць. «Ідзе актыўнае фарміраванне праграмы будучай пяцігодкі, а гэта ўсё сур'ёзныя фінансавыя патокі і рэсурсы, — акцэнтаваў увагу Дзмітрый Крутой. — Пастанове, якая рэгулюе работу з гэтымі аб'ектамі, ужо 20 гадоў. Кіраўнікі аблвыканкамаў гавораць, што нам патрэбны больш актуалізаваны пералік такіх аб'ектаў, каб закладваць фінансаванне. Улічваючы, што асноўны спіс фарміраваўся ў 1990-я гады і многае ўжо страціла актуальнасць, вельмі важны пункт гледжання нашых гісторыкаў: што нам дасць эфект у росце турыстычнага патэнцыялу, захаванні нашай гістарычнай памяці».

Асобным блокам прагучала тэма каардынацыі паміж вузаўскай навукай і профільнымі інстытутамі Нацыянальнай акадэміі навук у частцы актуальнасці тэм дысертацыйных даследаванняў па сацыяльна-гуманітарных дысцыплінах. Мяркуецца, што адпаведныя паўнамоцтвы ў гэтым плане з'явяцца ў Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях, які павінен стаць своеасаблівым камітэтам дзяржкантролю ў гэтай частцы.

«Не хочацца паліць рэсурсы — і людскія, і фінансавыя — на неактуальныя тэмы, — патлумачыў мэтазгоднасць такой прапановы Дзмітрый Крутой. — Спецыялісты Нацыянальнай акадэміі навук у чарговы раз пацвердзілі, што ў нас мільёны (я не перабольшваю) старонак неразабраных архіваў. І нашых гісторыкаў, даследчыкаў трэба накіраваць на тыя тэмы, якія найбольш важныя, запатрабаваныя і актуальныя».

### МІЖНАРОДНЫЯ СТАСУНКІ Ў СПРАВЕ ЗАХАВАННЯ ПАМЯЦІ І ЭКСПАЗІЦЫЯ БУДУЧАГА МУЗЕЯ

Што датычыцца супрацоўніцтва Беларусі з іншымі краінамі па пытанні захавання гістарычнай памяці, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта праінфармаваў, што да гэтай тэмы праяўляюць вялікую цікавасць гісторыкі з Расіі, Казахстана, іншых краін СНД. «Яны гатовы выдзяляць фінансаванне на рэканструкцыю пэўных падзей у нас, будаўніцтва мемарыяльных комплексаў, помнікаў», — канкрэтызаваў Дзмітрый Крутой. Кожны міжнародны праект падобнай тэматыкі праходзіць экспертызу Рэспубліканскага савета па гістарычнай палітыцы.

Абмеркавалі падчас пасяджэння і тэматычнае напаўненне новага Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі, які ўзводзіцца ў Мінску.

«Будаўнічыя работы ў высокай ступені гатоўнасці, мы падыходзім да стадыі падрыхтоўкі экспазіцыі ў гістарычных залах, — паведаміў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. — Таму меркаванне членаў Рэспубліканскага савета па гістарычнай палітыцы ў гэтым працэсе вельмі важнае. Мы не павінны памыліцца».

**Вераніка КАНЮТА.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ
ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
*(организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, местонахождение: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321)*
по поручению **ОАО «Миноблавтотранс» филиал «Автомобильный парк № 17»**
*(продавец, местонахождение: г. Столбцы, ул. Я. Коласа, 96)*
проводит открытый аукцион по продаже:

**Лот № 1: автомобиль грузовой MAZ 5440 E9,**
**2013 г. в., регистрационный знак АМ 4090-5, рама № Y3M5440E9D0000239, цвет белый, седельный тягач, дизель, объём двигателя – 12л, мех. коробка передач.**
**Начальная цена – 38 280,00 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены – **3 828,00 бел. руб.**

**Лот № 2: полуприцеп бортовой тентовый MAZ-975830-3012,**
**2013 г. в., регистрационный знак А 6109 В-5, рама № Y3M975830D0006205.**
**Начальная цена – 20 880,00 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены **– 2 088,00 бел. руб.**

**Лот № 3: полуприцеп бортовой тентовый WIELTON NS34ST,**
**2008 г. в., регистрационный знак А 4816 А-5, рама № SUDNS1STA81015636.**
**Начальная цена – 24 000,00 бел. руб.**
Задаток 10 % от начальной цены **– 2 400,00 бел. руб.**

**Транспортные средства расположены по адресу: Минская область, г. Столбцы, ул. Я. Коласа, 96.**

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, OTHR.

**Условия аукциона:**
- имущество приобретается на условиях 100 % предоплаты и оплаты Покупателем (единственным участником) аукциона комиссионного вознаграждения банку за проведения данного платежа;
- Покупатель обязан за свой счёт принять приобретаемое имущество, в том числе осуществление вывоза, хранения, погрузочно-разгрузочных работ;
- на Покупателя возлагается обязанность по переоформлению (в ГАИ, военкомате), снятию и постановке на учёт приобретаемого имущества за свой счёт.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) рабочих дней с даты проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения: в любое время, но не позднее, чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течении 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение в размере: 10 (десяти) процентов от цены продажи предмета аукциона, а также возмещает затраты на публикацию извещения о проведении торгов.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 02.08.2025.

Электронные торги состоятся **07.10.2025** в **10.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие* и необходимые документы принимаются по **03.10.2025** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 102-21-17, 516-80-64.**
**Тел. для осмотра: (8044) 778-90-57.**

УНП 601070236

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки)
извещает о проведении повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «БЕЛГАЗСТРОЙ»-управляющая компания холдинга»**
(Продавец).

**Электронные торги состоятся 09.10.2025.**

**Лот № 1:** Грузовой седельный тягач MZKT-740100, кузов (рама) № Y3K74010090400042, 2009 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 102 360,00 руб.
Задаток – 10 236,00 руб.

**Лот № 2:** Полуприцеп платформа MZKT 99867, кузов (рама) № Y3K99867090300153, 2009 г. в.
Начальная цена с НДС 20 % – 75 000,00 руб.
Задаток – 7 500,00 руб.

**Местонахождение Лотов 1-2:**
Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Западная, 17.

**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 07.10.2025 в 16.00.

**Организатор электронных торгов:**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52,**
**torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

В газете «Звязда» от 23.09.2025 ООО «Фрондера» было размещено извещение о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Строймаш».
**Аукцион по Лотам №№ 2125–2127 (компрессоры) отменен по решению продавца.**
Подробнее о торгах по тел. +375293082897, Анаида

УНП 100104712

**Ликвидатор Совместного общества с ограниченной ответственностью «Петрофф Плюс» объявляет о проведении торгов по продаже имущества в форме электронного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Продавец** | Совместное общество с ограниченной ответственностью «Петрофф Плюс»; УНП 190861019; г. Минск, ул. Лещинского, 12-9; тел. +375 29 667 16 72 |
| **Организатор электронного аукциона, оператор электронной торговой площадки** | Общество с ограниченной ответственностью «БелКомиссионер»; УНП 193648539; г. Минск, пр-т Газеты Звязда, д. 16, пом. 57; эл. адрес: aferta.by@gmail.com; тел. + 375 29 649 69 29 |
| **Место проведения торгов** | Электронная торговая площадка https://aferta.by |
| **Дата и время проведения торгов** | 15.10.2025 г. с 9.00 до 16.00 |
| **Срок подачи заявок** | Не позднее 10.10.2025 г. до 17.00 |
| **Ранее опубликованные извещения о проведении торгов** | Газета «Звязда» от 02.12.2023 № 234 (300964), от 14.02.2024 № 31 (30165), от 13.04.2024 № 74 (30208), от 18.09.2024 № 182 (30316), от 29.11.2024 № 233 (30367), от 04.02.2025 № 23 (30411), от 25.03.2025, от 13.05.2025, от 09.08.2025 № 152 (30540) |
| **Предмет торгов и начальная цена** | |

| № лота | Наименование лота | Начальная цена лота, руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 500/С-43932, адрес: г. Минск, ул. Лещинского, 12, общей площадью 1204,5 кв. м, наименование: главный корпус станции технического обслуживания, назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные и газонаполнительные станции) | 1 800 000 |
| 2 | Капитальное строение с инв. № 500/С-43933, адрес: г. Минск, ул. Лещинского, 12/1, общей площадью 721,9 кв. м, наименование: помещение мойки, кафе, административные помещения, назначение: здание многофункциональное | 1 240 000 |
| 3 | Капитальное строение с инв. № 500/С-43836, адрес: г. Минск, ул. Лещинского, 12/2, общей площадью 538,4 кв. м, наименование: вспомогательный корпус станции технического обслуживания, назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные и газонаполнительные станции) | 725 000 |

| | |
|---|---|
| **Земельный участок** | Все лоты расположены на земельном участке с кадастровым номером 500000000006004137, расположенном по адресу: г. Минск, ул. Лещинского, 12, площадью 1,1693 га, на праве аренды |
| **Обременения** | Ипотека, аренда |
| **Порядок подачи заявок** | Заявления на участие в торгах с приложением платежных документов, подтверждающих внесение задатка, принимаются на сайте https://aferta.by |
| **Задаток** | Задаток в размере десяти процентов от начальной цены лота перечисляется на р/с BY66ALFA 30122C59770010270000 в ЗАО «Альфа-Банк», БИК ALFABY2X, получатель – ООО «БелКомиссионер», УНП 193648539 |
| **Условия и порядок проведения аукциона** | Электронные торги проводятся в порядке, установленном Регламентом электронной торговой площадки «aferta.by». Для участия в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом ЭТП, зарегистрироваться на ЭТП, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. Шаг электронных торгов – 5 % от начальной цены лота. Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц. Победитель торгов, а при признании торгов несостоявшимися в связи с наличием заявления на участие в них только от одного участника, и он согласен приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, – претендент на покупку, обязан: в течение 5 рабочих дней после утверждения протокола электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение торгов, оплатить услуги оператора ЭТП; в течение 15 рабочих дней со дня проведения торгов и утверждения протокола электронных торгов подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов; оплатить предмет электронных торгов в течение 15 рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи. С подробной информацией о предмете торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте https://aferta.by. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 10.00 до 16.00 по месту нахождения имущества по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 29 667 16 72 |



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

Организатор: **Государственное предприятие «Жилищное коммунальное хозяйство № 2 Фрунзенского района г. Минска»,**

*220104, г. Минск, ул. Матусевича, 42, тел. +375173600685.*

УНП 192605364

**Торги проводятся 27.10.2025 г. ЭТП «БУТБ-Имущество», www.et.butb.by.**

**Право заключения договора аренды на изолированное помещение,**

**расположенное по адресу: г. Минск, ул. Игнатовского, 3.**

Окончание приема заявлений – 22.10.2025, до 15.00.



УНП 193655784

**ООО «Китайские продукты»** информирует покупателей (потребителей)

ОБ ОРГАНИЗАЦИИ ВОЗВРАТА ПРОДУКЦИИ ИЗГОТОВИТЕЛЯ

**Zhengzhou Yuanhao Food Co., Ltd.**

Возврат можно осуществить в месте приобретения продукции.


НАПЯРЭДАДНІ

# ДЭМАНСТРАЦЫЯ ДАСЯГНЕННЯЎ І ПАДПІСАННЕ ВЫГАДНЫХ КАНТРАКТАЎ

БОЛЬШАЯ ПРОМЫШЛЕННАЯ НЕДЕЛЯ БЕЛАРУСЬ ИННОПРОМ



## Якой будзе выстаўка «ІНАПРАМ», што ўпершыню праводзіцца ў Беларусі

Наступны тыдзень у нашай краіне будзе насычаны важнымі падзеямі. Разам з міжнароднай выстаўкай «ІНАПРАМ. Беларусь» пройдуць Савет кіраўнікоў урадаў СНД і пасяджэнне Еўразійскага міжурадавага савета, на які чакаецца прыбыццё кіраўнікоў урадаў краін СНД.

Сама ж выстаўка «ІНАПРАМ» распачнецца 29 верасня. Гэта міжнародная прамысловая выстаўка, якая збірае вялікую колькасць прамысловых прадпрыемстваў, навуковую супольнасць. На сваіх экспазіцыях яны могуць прадэманстраваць свае дасягненні, найноўшыя распрацоўкі, перадавыя тэхналогіі, запатрабаваныя ў розных сферах дзейнасці, у тым ліку рэалізуемыя ў рамках маштабных інавацыйных праектаў.

Выстаўка ўжо заняла сваё годнае месца сярод падобных мерапрыемстваў . Традыцыйна з 2010 года яна праходзіць у Екацярынбургу, з 2019 года — ужо і на іншых, міжнародных пляцоўках за межамі Расійскай Федэрацыі. «Выстаўка праходзіла ў Егіпце, Казахстане, Узбекістане. У гэтым годзе ўпершыню форум прымае Беларусь.

### МАШТАБНЫЯ ЭКСПАЗІЦЫІ, ШЫРОКАЯ ПРАГРАМА



**Намеснік прэм'ер-міністра Віктар КАРАНКЕВІЧ** расказаў у эфіры тэлеканала «Першы інфармацыйны», якой будзе выстаўка «ІНАПРАМ-2025», што пройдзе ў Мінску 29 верасня — 1 кастрычніка.

На ёй плануецца размяшчэнне вялікай колькасці экспазіцый. Мінскі міжнародны выставачны цэнтр — гэта вялізныя крытыя плошчы, але экспазіцыі будуць размяшчацца і на адкрытай пляцоўцы — там будуць прадстаўлены апошнія ўзоры айчыннай тэхнікі і тэхнікі, якая выраблена на беларуска-расійскіх сумесных прадпрыемствах.

Мерапрыемства будзе праходзіць у адзін час з Саветам кіраўнікоў урадаў СНД і пасяджэннем Еўразійскага міжурадавага савета.

Усяго ў рамках выстаўкі плануецца ўдзел больш як 300 суб'ектаў гаспадарання, якія прадэманструюць свае новыя дасягненні і ўзоры новай прадукцыі.

«На «ІНАПРАМЕ» плануецца правядзенне розных сустрэч, панэльных сесій. Прэзентацыйныя матэрыялы будуць дэманстравацца спікерамі, экспертамі. Таксама плануецца правядзенне круглых сталоў на ўзроўні кампаній, арганізацый, суб'ектаў гаспадарання, дзе можна будзе падзяліцца вопытам, сваімі ведамі, новымі сваімі распрацоўкамі. Ну і, зноў жа, намеціць новыя кірункі ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва і заключыць кантракты на пастаўку тэхнікі або вытворчасць той ці іншай прадукцыі», — сказаў Віктар Каранкевіч.

Ад Беларусі будзе прадстаўлена каля 90 прадпрыемстваў і арганізацый. «Будзе прадстаўлена экспазіцыя Міністэрства прамысловасці і гандлю Расійскай Федэрацыі, органаў дзяржаўнага кіравання і ключавых галін Рэспублікі Беларусь, будуць стэнды экспазіцыі краін СНД, Еўразійскай эканамічнай камісіі, буйных дзяржкарпарацый, такіх як «Расатам» і «Растэх». Прэзентуюць прадукцыю і буйныя прадпрыемствы Беларусі і Расіі, якія могуць прадэманстраваць найноўшыя свае дасягненні, новыя распрацоўкі, якія былі б карыснымі для выкарыстання ў розных сферах дзейнасці», — рэзюмаваў віцэ-прэм'ер.

### АД МАШЫНАБУДАВАННЯ ДА IT-ТЭХНАЛОГІЙ



Як расказаў на прэс-канферэнцыі **старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Міхаіл МЯТЛІКАЎ,** на «ІНАПРАМ. Беларусь» зарэгістравалася каля 7 тысяч удзельнікаў і наведвальнікаў з 22 краін.

Ад Беларусі на выстаўцы будзе прадстаўлена 70 стэндаў, у тым ліку калектыўныя экспазіцыі, дзе прадукцыю прэзентуюць амаль 200 айчынных прадпрыемстваў. Усяго каля 500 арганізацый пакажуць сваю прадукцыю і навінкі. Удзельнікамі экспазіцыі з'яўляюцца прадпрыемствы ведамаснай прыналежнасці — Міністэрства прамысловасці, Міністэрства энергетыкі, Міністэрства адукацыі, Акадэміі навук і Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях, «Белнафтахіма», «Беллегпрама», рэзідэнты тэхнапаркаў, свабодных эканамічных зон, прыватныя кампаніі. Беларуская экспазіцыя займае цэлых 6 тысяч кв. м унутры і каля 3 тысяч кв. м вулічнай пляцоўкі.

«Будуць прадстаўлены такія галіны, як машынабудаванне, прамысловыя і IT-тэхналогіі, металургія і матэрыялы, аўтаматызацыя вытворчасці, хімічная прамысловасць, паслугі ў галіне прамысловасці. Ужо на сённяшні дзень зарэгістравалася каля 7 тысяч удзельнікаў і наведвальнікаў з 22 краін свету. Мы чакаем вялікую, сапраўды, колькасць гасцей і наведвальнікаў выстаўкі», — падкрэсліў Міхаіл Мятлікаў. Усяго чакаецца 10 тысяч удзельнікаў і наведвальнікаў.

### НОВЫЯ РАШЭННІ АД АЙЧЫННЫХ МАШЫНАБУДАЎНІКОЎ

Адна з самых вялікіх экспазіцый на выстаўцы будзе ад беларускага Мінпрама. Як расказаў **першы намеснік міністра прамысловасці Беларусі Андрэй КАНЮШКА,** многія прадпрыемствы прадэманструюць свае навінкі на плошчы ўнутры Мінскага міжнароднага выставачнага цэнтра, а таксама на адкрытым паветры. Вулічная пляцоўка будзе прадстаўлена тэхнікай 14 беларускіх прадпрыемстваў на плошчы 2480 кв. м (у тым ліку ў рамках сумесных вытворчасцяў з расійскімі і казахстанскімі партнёрамі), з іх восем арганізацый Міністэрства прамысловасці на плошчы 1758 кв. м.



У цэнтральнай частцы беларускага павільёна будзе размешчана экспазіцыя МАЗа, у рамках якой прадстаўлены натурны ўзор седлавога гібрыднага цягача MAZ-545000 (новае рашэнне МАЗ-Х, створанае на базе гібрыднай платформы з электрамеханічнай трансмісіяй).

Андрэй Канюшка ўпэўнены, што ўвагу наведвальнікаў прыцягне і калектыўная экспазіцыя станкабудаўнічых арганізацый Мінпрама.

СЗАТ «БЕЛДЖЫ» прадэманструе знакавы прадукт айчыннага аўтапрама — гібрыдны красовер BELGEE X80 PHEV. «Запрашаем наведаць і азнаёміцца з нашым айчынным легкавым аўтамабілебудаваннем», — сказаў Андрэй Канюшка.

На стэндзе БЕЛАЗа можна будзе ўбачыць макет, які дэманструе тэхналогію беспілотнага кіравання тэхнікай БЕЛАЗ на вадародным паліве, а таксама макеты гідраўлічнага экскаватара ВХ20012 і кар'ернага самазвала БЕЛАЗ-7513М2.

«БКМ Холдынг» прадставіць інтэрактыўную панэль, якая дазволіць дэталёва разгледзець экстэр'ер і інтэр'ер электробуса мадэлі Е321, сучлененага электробуса Е433 і нізкападлогавага трамвая Т811. На стэндзе сельскагаспадарчай тэхнікі МТЗ прэзентуе трактар BELARUS 1222.3, які атрымаў Дзяржаўны знак якасці, а на вулічнай пляцоўцы будзе прадстаўлены самы магутны трактар у свеце ў класічнай кампаноўцы BELARUS-5425, аснашчаны высокаэфектыўным рухавіком WEICHAI магутнасцю 542 к. с. Побач з трактарамі размесціцца навясное і прычапное абсталяванне холдынгаў «Лідсельмаш» і «Бабруйскаграмаш».

### ПРЫЕДУЦЬ КАЛЯ 20 РАСІЙСКІХ ГУБЕРНАТАРАЎ



Шырокае прадстаўніцтва будзе і ад расійскіх рэгіёнаў. **Намеснік міністра замежных спраў Павел УЦЮПІН** паведаміў, што выстаўку «ІНАПРАМ. Беларусь» наведаюць прадстаўнікі каля 40 рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі. «Больш за палову з іх — удзельнікі. Каля 20 дэлегацый будуць прадстаўлены на ўзроўні першых асоб рэгіёнаў», — расказаў ён. Паводле слоў намесніка міністра, запланавана правядзенне пасяджэнняў каля 10 рабочых груп па супрацоўніцтве з расійскімі рэгіёнамі і саветаў дзелавога супрацоўніцтва.

**Паводле БелТА.**

МЕДЫЯПРАСТОРА

# ІСЦІ РОЗНЫМІ ШЛЯХАМІ, АЛЕ Ў АДНЫМ НАПРАМКУ

## У Беларусі стартаваў II Форум блогераў «БлогБай. Сіла ў праўдзе»

У чацвер на базе Ваеннай акадэміі стартаваў II Форум блогераў «БлогБай. Сіла ў праўдзе». Ён аб'яднаў каля 100 прадстаўнікоў медыйнай супольнасці краіны, якія на працягу некалькіх дзён будуць спасцігаць асновы армейскага побыту і здымаць аб гэтым якасны і праўдзівы кантэнт. Форум таксама стане ключавой пляцоўкай для абмену вопытам, навучання і нэтворкінгу блогераў розных кірункаў.



### «І ВЫ, І МЫ ВЕЛЬМІ ХОЧАМ АХАПІЦЬ СВАЁЙ УВАГАЙ ВЯЛІКУЮ АЎДЫТОРЫЮ»



Адкрываючы форум, **намеснік Прэм'ер-міністра Наталля ПЯТКЕВІЧ** прызналася, што сацсетак у яе няма, але дзяржорганы нацэлены на супрацоўніцтва з блогерскай супольнасцю: «Удзельнікі адчуваюцца як людзі з розных планет: адны зрабілі сацсеткі сваёй працай, а ў іншых іх нават няма. Але ў нас шмат агульнага, і ёсць тое, што аб'ядноўвае. Як мінімум дзве рэчы, на якіх я хацела б спыніцца. Першае — гэта блогеры і органы улады. І вы, і мы вельмі хочам ахапіць сваёй увагай вялікую аўдыторыю. У вас гэта часам атрымліваецца лепш і больш эфектыўна. І другое — мабыць, самае галоўнае — гэта наша краіна, дзеля якой мы ўсё гэта робім. Хтосьці ў гэтым прызнаецца, хтосьці не. Насамрэч любоў да Радзімы — гэта і ёсць патрыятызм. Таму кожны з нас імкнецца зрабіць нешта вельмі добрае для сваёй краіны».

Наталля Пяткевіч нагадала, што форум блогераў у краіне праходзіць ужо ў другі раз, і гэта радуе. «Бо можна ісці рознымі шляхамі, але галоўнае — ісці ў адным напрамку», — акцэнтавала намеснік Прэм'ер-міністра. Яна падкрэсліла, што другі год правядзення форуму — гэта ўжо не пачатак, а пракладзены шлях, па якім мы пойдзем і далей.

### КАШТОЎНАСЦІ, ЗАСНАВАНЫЯ НА ЛЮБОВІ ДА КРАІНЫ



У сваю чаргу **міністр інфармацыі Марат МАРКАЎ** адзначыў: «Чакаем ад блогераў і кантэнту, і ўзаемадзеяння». Паводле яго слоў, мінулы год паказаў, што дзяржава ў асобе Міністэрства інфармацыі можа добра ўзаемадзейнічаць з блогерскай супольнасцю. «Таму што каштоўнасці ў нас насамрэч вельмі падобныя. Каштоўнасці глабальныя, якія заснаваныя на любові да краіны, на тым, што ўсе мы хочам жыць у нармальнай, прыгожай, мірнай, выдатнай краіне», — сказаў міністр інфармацыі.

Марат Маркаў падкрэсліў: дзякуючы таму, што дзяржава і блогеры могуць знайсці агульныя падыходы, адным з якіх з'яўляецца форум «БлогБай», ёсць магчымасць працаваць разам і захоўваць гэтыя глабальныя каштоўнасці. Кіраўнік ведамства таксама звярнуў увагу на тое, што ўдзельнікі форуму зацікаўлены, каб дзяржава прыслухоўвалася да іх меркавання: «Наша заканадаўства крыху адрозніваецца ад заканадаўства нават бліжэйшых суседзяў. Перш чым прымаць нейкія нормы, мы зацікаўлены ў тым, каб яны былі ўзважанымі. І вось у гэтым выпадку мы таксама можам знайсці агульныя падыходы. Я ўпэўнены, што, грунтуючыся на гэтых базісах, мы заўсёды будзем супрацоўнічаць», — падкрэсліў Марат Маркаў.

Паводле яго слоў, сёлета змяніўся фармат форуму: «Была адкрытая падача заявак, іх было пададзена больш за 200. Мы адабралі прыкладна палову. Пасля таго як мы пагутарылі з гэтымі людзьмі і адкрылі ім карты, расказаўшы, што прыкладна іх чакае, пэўная колькасць людзей адсеялася. Я вам адкрыю маленькую таямніцу: 8 чалавек адсеяліся за апошнія суткі, калі ўбачылі тэмпературныя рэжым і зразумелі, што ім давядзецца злезці з цёплай канапы».

Пры гэтым удзельнікаў усё ж некалькі больш, чым разлічвалі арганізатары. «Я вельмі ўдзячны вам за гэта, таму што ў маім разуменні блогер — гэта не толькі той, хто «піліць кантэнт». На мой погляд, гэта чалавек, у якога ёсць пэўны стрыжань, і ён уяўляе сабой асобу. Толькі тады ён можа нешта навязваць іншым у якасці свайго меркавання», — падзяліўся кіраўнік ведамства.

### «СТРАШНА? ТРОХІ. ЦІКАВА? ВЕЛЬМІ!»

Для многіх удзельнікаў II Форуму блогераў Беларусі «БлогБай. Сіла ў праўдзе» стаў пляцоўкай для знаёмстваў і сустрэч. **Блогер Аркадзь Логвін** паведаміў, што з некаторымі калегамі ўжо дамовіўся на супрацоўніцтва. Як і многія блогеры, Аркадзь сёння вядзе некалькі старонак у розных сацсетках. У адным Instagram у яго больш за 60 тысяч падпісчыкаў. «Я задаю на вуліцы пытанні з «падколам», звязаныя з адносінамі», — сказаў блогер, які апошнім часам таксама ўдзяляе ўвагу невялікім ролікам і відэа, якія прасоўваюць здаровы лад жыцця.

Блогер адзначыў, што трапіць на форум ён хацеў адразу пасля заканчэння першага. «Я падпісаны на Telegram-канал Міністэрства інфармацыі і сачу за навінамі. Вырашыў паўдзельнічаць, падаў заяўку, і мне патэлефанавалі», — падзяліўся Аркадзь Логвін. Праграма форуму, паводле яго слоў, вельмі багатая на падзеі. «Для мяне як для мужчыны, які не служыў, гэта наогул вельмі крута. Заўсёды хацелася вывучыць гэту тэматыку, і арганізатары трапілі ў сэрца», — сказаў ён.

**Блогер з нікам ПалВаніч (Павел Дзмітрыеў)** прыехаў з Кобрына па новыя знаёмствы і круты кантэнт. Кажа, што лозунг «Сіла ў праўдзе» стане арыенцірам для стварэння відэа і фота: «Я рады, што форум блогераў становіцца традыцыйным. Хоць у гэты раз ён кардынальна адрозніваецца. За тры дні мы пройдзем экспрэс-курс маладога байца. Страшна? Трохі. Цікава? Вельмі! Удзельнікі толькі зарэгістраваліся, але ўжо адчуваецца нейкае адзінства, агульная мэта. Мы — своеасаблівы інфармацыйны батальён. Будзем расказваць пра тое, хто і як абараняе краіну, хто забяспечвае мірнае жыццё».

Яшчэ адзін удзельнік форуму — **блогер і журналіст з Гродна Ягор Скяпко** — падзяліўся сваімі чаканнямі. Ён адзначыў, што форум сабраў у адным месцы крутое кам'юніці: «Хочацца абмяняцца меркаваннем і ўбачыць разнастайнасць нашай супольнасці». Блогер падкрэсліў, што яму цікава пабываць у Ваеннай акадэміі, убачыць ваенныя аб'екты і паказаць гэта гледачам, якія не маюць такой магчымасці: «На маю думку, такая тэматыка вельмі запатрабаваная і актуальная».

У асноўным Ягор Скяпко вядзе акаўнты ў TikTok і Instagram, дзе распавядае пра родны Гродна і яго жыхароў, паралельна працуе на тэлеканале «Гродна Плюс». «Я шмат дзе бываю, шмат чаго бачу, шмат з кім знаёмлюся і шмат што спрабую. І аўдыторыі такі лайф-кантэнт заходзіць», — адзначыў ён.

II Форум блогераў Беларусі «БлогБай. Сіла ў праўдзе» прадоўжыцца да 27 верасня. Наперадзе для ўдзельнікаў форуму — шмат новага, цікавага і незвычайнага.

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота БелТА.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390. (www.cpo.by) |
| **Продавец** | ОАО «Слуцкий мясокомбинат», 223610, Минская обл., г. Слуцк, ул. Тутаринова, д. 18. УНП 600119108 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191 224 638. (www.ipmtorgi.by) |

**Предмет электронного аукциона:**

**Легковой джип VOLKSWAGEN TOUAREG,**
VIN WVGZZZ7LZ7D026033, рег. знак 9191 ВВ-5, 2006 г. в.
Местонахождение:
Минская область, г. Слуцк, ул. Тутаринова, д. 18

**Начальная цена с НДС 20 % – 13 830,48 руб. (снижена на 10 %)**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN); БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 10 (десять)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6 %** от цены продажи лотов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до момента определения победителя торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звезда» от 15.08.2025.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 13.10.2025 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 10.10.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу **www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35.
E-mail: auction@cpo.by**

УНП 100783994

ОРГАНИЗАЦИЯ ПРОДАЕТ

**ТОКАРНЫЙ СТАНОК 165 ДИП 500, РМЦ - 2800 мм**

В хорошем состоянии.

Безналичный расчет. **Станок подключен, проверен, настроен.**

По всем вопросам обращаться по телефону:
**8 (029) 334-97-00,** Юрий Васильевич.

**Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ**

| Предметы торгов | Начальная цена, руб. (с учетом НДС) | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1:** легковой седан АУДИ А6, год выпуска 2008 г., регистрационный знак 0003 ВХ-1, кузов № WAUZZZ4FX9N027686 | 18 720,00 | 1 872,00 |
| **Лот № 2:** грузовой бортовой двухкабинник ГАЗ 33023 408, год выпуска 2008 г., регистрационный знак АВ 5264-1, кузов № 33023080098684 X963302308061135 | 6 240,00 | 624,00 |
| **Лот №3:** строгальный 4-х сторонний деревообрабатывающий станок МП-9, инвентарный номер 40587 | 3 360,00 | 336,00 |
| **Лот № 4:** токарный станок с ЧПУ 16А20ФЗС15, инвентарный номер 40529 | 3 480,00 | 348,00 |
| **Лот № 5:** станок вертикально-сверлильный 2Н18, инвентарный номер 40857 | 1 920,00 | 192,00 |
| **Лот № 6:** кран мостовой опорный 1А-5, 0-6,38, инвентарный номер 40718 | 9 240,00 | 924,00 |
| **Лот № 7:** кран мостовой опорный КО-5-6,38 с электроталью 5 т, инвентарный номер 40719 | 5 880,00 | 588,00 |
| **Лот № 8:** кран мостовой электрический однобалочный, инвентарный номер 40710 | 5 880,00 | 588,00 |
| **Лот № 9:** кран-балка 2 т, инвентарный номер 40997 | 3 960,00 | 396,00 |

**Местонахождение объекта торгов:** Брестская обл., г. Береза, ул. Ленина, 100.
**Организатор электронных торгов, оператор электронной торговой площадки:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701, gostorg.by.
**Продавец:** ОАО «Теплоприбор», 225209, Брестская обл., г. Береза, ул. Ленина, 100, тел./факс 80164341970

**Электронные торги состоятся 29 октября 2025 г. в 11.00**

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG». Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП, **ocenkabrest.by,** а также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-41**

**Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 27.10.2025 до 16.00**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | СТОАО «Світанак», Гродненская обл., г. Слоним, ул. Красноармейская, д. 4. УНП 500041006 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638, **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1 – 31/50 доли в праве собственности на здание нежилое** (инв. № 450/С-2946, 6158,8 кв. м, сост. части: подвал, бордюры, покрытия, благоустройство, газон).
Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Коссовский Тракт, 100.** В состав лота входят **канализационные сети** (инв. № 450/С-31477, 82,6 м).
***Сведения о земельных участках*:** пл. **0,8074** га, предоставлен на праве постоянного пользования; три участка предоставлены на праве аренды (срок действия: по 11.05.2072) пл. **0,0001 га, 0,0001 га, 0,0016** га. **Обременения: площади здания, принадлежащие продавцу, частично сданы в аренду.** Подробная информация у организатора торгов и на сайте cpo.by

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 3 409 800,00 бел. руб.**

**Лот № 2 – Здание** (инв. № 450/С-24780, общ. пл. 414,8 кв. м, сост. части: две пристройки); **канализационные сети** (инв. № 450/С-24783, сост. части: канализац. колодец); **тепловая сеть** (инв. № 450/С-24781). **Обременение: договор аренды.**
Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Брестская, д. 67, корп. 1.**
***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0587 га,** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 20.09.2071) для строительства и размещения объектов коммунального хозяйства.
В состав лота входит иное имущество: линия электросетей м-н «Интерьер»

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 108 294,00 бел. руб.**

**Лот № 3 – Склад (баня)** (инв. № 450/С-18993, общ. пл. 318 кв. м, составные части: уборная, три пристройки, ворота, забор).
Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Хлюпина, д. 14.**
***Сведения о земельном участке***: пл. **0,1445 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия: по 01.11.2041) для строительства и обслуживания здания склада (бани)

**Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 19 320,00 бел. руб.**

**Лот № 4 – Столовая** (инв. № 450/С-18925, общ. пл. 672,7 кв. м, составные части: Подвал, две пристройки, электроснабжение (1), канализационная сеть (Д), водопроводная сеть (Е), канализационный колодец (д1), водопроводный колодец (е1), покрытие (Ж, И, К), плиточное покрытие (Л), бордюр тротуарный (Л1), ограждение (М, Н), калитка (Н1)). Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Красноармейская, д. 283, корп. 1.**
***Сведения о земельном участке***: пл. **0,1316 га,** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия: по 20.09.2071) для строительства и обслуживания здания столовой

**Начальная цена лота № 4 с НДС 20 % – 289 200,00 бел. руб.**

**Лот № 5 – Административное здание (совместно с гаражом и котельной)** (инв. № 450/С-29152, общ. пл. 547,3 кв. м, сост. части: пристройка, дымовая труба), **склад № 2** (инв. № 450/С-29155, общ. пл. 568 кв. м, сост. части: Пристройка (2Б/кз), пристройка (1)); **трансформаторная подстанция** (инв. № 450/С-29156, общ. пл. 40,1 кв. м); **здание проходной** (инв. № 450/С-29153, общ. пл. 31,6 кв. м); **благоустройство территории** (инв.№ 450/С-31422, общ. пл. 1076,1 кв. м, сост. части: А-Благоустройство территории, а.1 Покрытие, а1.1Бордюр, а2 Ограждение, а2.1 Ворота, а3 Эстакада, а3.1 Ограждение). Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Минский Тракт, д. 4, корп. 1-3, д. 4, 4/4.**
***Сведения о земельном участке***: пл. **0,6679 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия: по 30.07.2068) для размещения объектов оптовой торговли, материально-технич. и продовольствен. снабжения, заготовок и сбыта продукции.
В состав лота входит иное имущество: котел отопительный твердотопливный КОТВ-95; насос К45/30с дв. 7,5/3000

**Начальная цена лота №5 с НДС 20 % – 386 640,00 бел. руб.**

**Лот № 6 – Нежилое здание,** инв. № 450/С-24046, общ. пл. 415,5 кв. м. Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Я. Купалы, д. 13.** В состав лота входят **линия электропередачи** (инв. № 450/С-23996, 6,0 м), **водопроводная сеть** (инв. № 450/С-23995, 79,0 м).
***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0457** га, предоставлен на праве аренды по 12.07.2071 для строительства и обслуживания зданий по улице Я. Купалы, 13

**Начальная цена лота № 6 с НДС 20 % – 26 653,20 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 30 (тридцать)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере по лоту № 1 – **2 %**, по лотам №№ 2, 4, 5 – **4 %,** по лоту № 3, 6 – **6 %** от цены продажи в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

*Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» 16.05.2025*

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 27.10.2025 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 24.10.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35.
E-mail: auction@cpo.by**


ХАРЧОВАЯ БЯСПЕКА

# НЕ ТОЛЬКІ ВЫРАСЦІЦЬ, АЛЕ І ЗАХАВАЦЬ

**У рэгіёнах пачалі закладку агародніны на міжсезонне**



Сёлета Гомельшчына ставіць перад сабой задачу — закласці ў стабілізацыйныя фонды 18 тысяч тон сельскагаспадарчай прадукцыі. Паступленне харчовых рэзерваў забяспечаць больш за дваццаць гаспадарак паўднёва-ўсходняга рэгіёна.

## ШТО ЗАКЛАДВАЕЦЦА?

Першай на закладку трапляе культура, якая патрабуе асаблівага падыходу, — цыбуля. Галоўкі гэтай расліны павінны добра высахнуць яшчэ ў полі, пасля чаго іх дадаткова дасушваюць і толькі потым перамяшчаюць у камеры. Сярод сельгасарганізацый, якія забяспечваюць харчовы запас цыбулі для рэгіёна, — фермерская гаспадарка ў Гомельскім раёне пад кіраўніцтвам Андрэя Парфянькова. Як перакананы фермер, цыбуляй спажывец вобласці будзе забяспечаны да канца лютага. Толькі ў агароднінасховішчах яго гаспадаркі можна змясціць да 600 тон прадукцыі.

— Сёлета ўраджай прыемна здзіўляе: дробнай цыбулі амаль няма, а сярэдняя ўраджайнасць складае 550 цэнтнераў з гектара. У параўнанні з мінулым годам вынікі выглядаюць непараўнальна лепшыя, — зазначаюць у фермерскай гаспадарцы.

У папаўненне стабфонду на Гомельшчыне важкі ўнёсак робіць сельгасарганізацыя «Брылёва». На прыкладзе гэтай гаспадаркі вельмі добра прасачыць, як пры захаванні ўсіх неабходных тэхналогій ідзе нарыхтоўка ледзь не галоўнага караняплода восеньскіхградак — морквы. Для закладкі на зіму мясцовыя аграрыі выкарыстоўваюць у першую чаргу сярэдняспелыя і познія сарты. Іх убіраюць у апошнюю чаргу, каб агародніна паспела набраць салодкасць, пакрылася шчыльнай лупінай. Убіраюць моркву толькі ўручную, гэта неабходна для таго, каб караняплод заставаўся цэлым і доўга захоўваў таварны выгляд.

Вядома, асноўнай культурай сезона ўсё ж такі застаецца бульба. На Гомельшчыне ў асобных гаспадарках ураджайнасць «другога хлеба» дасягнула 500 цэнтнераў з гектара. Захаваць ураджай належным чынам — не менш важная задача для працаўнікоў гаспадарак, таму ў сховішчах сёння — напружаная праца.

## СТРОГА ПА ТЭХНАЛОГІІ

Сапраўды, сучасныя сховішчы для агародніны — гэта тэхналагічныя інжынерныя комплексы з сістэмамі вентыляцыі, кантролю тэмпературы і вільготнасці. Усё гэта дае магчымасць захоўваць агародніну свежай на працягу доўгага часу. Вопыт у захоўванні агародніны аграрыяў Калінкавіцкага раёна ацаніў **памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці Руслан ПАРХАМОВІЧ**. Ён наведваў фермерскія гаспадаркі, філіялы спажывецкіх таварыстваў у Лельчыцкім, Калінкавіцкім і Жыткавіцкім раёнах. Таксама адным з аб'ектаў наведвання стала фермерская гаспадарка Калінкавіцкага раёна, якая вырошчвае садавіну і агародніну на больш як 700 гектарах зямлі. Мясцовыя фермеры вырошчваюць паўнавартасны «баршчовы набор», частка якога будзе закладзена ў стабілізацыйны фонд.

Руслан Пархамовіч ацаніў гатоўнасць сельгаспрадпрыемства да міжсезоннага захоўвання прадукцыі: выкананне ўмоў захоўвання, тэхналагічных патрабаванняў па захаванасці ўраджаю да наступнага сезона. Падчас агляду памочнік Прэзідэнта засяродзіў увагу аграрыяў на тэхнічным стане халадзільных установак, спраўнасці сістэм вентыляцыі, а таксама захаванні належнага санітарнага стану памяшканняў для захоўвання сельгаспрадукцыі.

## ДЗЯРЖАЎНАЯ ПАДТРЫМКА І КАНТРОЛЬ

Па інфармацыі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, у рамках дзяржзаказу на міжсезонне 2025/2026 года ў цэлым па рэспубліцы неабходна паставіць 148,78 тыс. тон прадукцыі.

Гэтыя аб'ёмы ўжо сфарміраваныя ў разрэзе ўсіх абласцей і горада Мінска з улікам патрэб гандлёвых сетак і ўстаноў сацыяльнай сферы, у тым ліку школ, бальніц і дзіцячых садкоў.

Каб гарантавана забяспечыць насельніцтва якаснымі прадуктамі ў перыяд міжсезоння, усе гаспадаркі павінны закласці прадукцыю на захоўванне да 15 лістапада.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,
фота ТК «Гомельшчына афіцыйна»**




# КАЛІ «АДТАЮЦЬ» БАТАРЭІ?

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

У рэгіёнах адпаведныя рашэнні ўжо прымаюцца. Як стала вядома, у Віцебскай вобласці ўжо з 25 верасня цяпло пачало паступаць на сацыяльныя аб'екты: у школы, бальніцы, дзіцячыя садкі і іншыя. Таксама адпаведнае рашэнне прынята і ў сталіцы. Аднак для жылфонду ўмовы трохі стражэй. Каб батарэі пацяплелі ў кватэрах, сярэднясутачная тэмпература паветра павінна быць 8 градусаў і ніжэй. Мяркуючы па прагнозе надвор'я, беларусам засталося чакаць зусім нядоўга.

## РАМОНТЫ ЗАВЕРШАНЫ І ПАЛІВА Ў НАЯЎНАСЦІ

Як да ацяпляльнага сезона падрыхтаваліся, расказаў **начальнік упраўлення камунальнай гаспадаркі і энергетыкі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Аляксей ФІЛАНОВІЧ**. Рэалізацыя большасці мерапрыемстваў па падрыхтоўцы аб'ектаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі да гэтага асенне-зімовага перыяду завершана ці знаходзіцца на завяршальнай стадыі. Праведзены капітальны рамонт 40 стальных катлоў, што практычна раўняецца запланаванаму паказчыку. А тэмп выканання задання па замене цеплавых сетак перавысіў 95 %. «Увогуле заменена 243 кіламетры сетак. Акрамя таго, выканана замена больш за 65 % неэканамічных катлоў», — заявіў Аляксей Філановіч.

Не забываюць спецыялісты і пра вяскоўцаў. Для іх створаны неабходны запас драўнянага і іншага паліва. На 99 % энергетычных крыніц атрыманы пашпарты гатоўнасці да ацяпляльнага сезона — усяго дакументы атрымалі 3383 аб'екты. Што датычыцца жылых дамоў, якія знаходзяцца на абслугоўванні арганізацый ЖКГ, то пашпарты гатоўнасці афармленыя на 97 % з іх. Па астатнім жыллёвым фондзе працэнт гатоўнасці яшчэ вышэйшы — прыкладна 98 %.

Праведзены прафілактычны рамонт сістэм ацяплення 42366 жылых дамоў, а таксама звыш 38 тысяч цеплавых пунктаў і вузлоў, што закрывае план практычна на 100 %. Акрамя таго, выконваўся рамонт дахаў жылых дамоў (план рэалізаваны на 99 %), стыкаў сценавых панэляў (заданне перавыканана). Для ўтрымання вулічна-дарожнай сеткі зімой у камунальных службах на балансе маецца больш за 3,5 тысячы адзінак снегаўборачнай і спецыяльнай тэхнікі, вядзецца нарыхтоўка пясчана-салянай сумесі.

Аляксей Філановіч упэўнены, што мерапрыемствы, якія праведзены, дазволяць забяспечыць устойлівую, безаварыйную эксплуатацыю і цеплавое забеспячэнне жыллёвага фонду ў ацяпляльны перыяд. Адказаў спецыяліст і на «гарачыя» пытанні. На думку начальніка ўпраўлення гаспадаркі і энергетыкі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, сёлета павышэнне тарыфаў на ацяпленне не плануецца.





## У РЭЗЕРВЕ — ПЕРАСОЎНЫЯ КАЦЕЛЬНІ

Як паведаміў **намеснік генеральнага дырэктара па камунальнай гаспадарцы ДА «Жыллёва-камунальная гаспадарка Мінскай вобласці» Андрэй ШУЛЬГА**, на балансе прадпрыемстваў ЖКГ Мінскай вобласці знаходзіцца 8771 жылы дом, з якіх 6622 будынкі маюць цэнтралізаванае ацяпленне і гарачае водазабеспячэнне. Выкананы неабходны бягучы рамонт, праведзены тэхабслугоўванне, выпрабаванні сістэм цеплазабеспячэння і іх прамыванне. Спецыялісты правяраюць працаздольнасць сістэм аўтаматычнага рэгулявання.

Ужо цяпер спажыўцы атрымалі 4815 пашпартоў гатоўнасці (96,8 % ад неабходнай колькасці), цеплавыя крыніцы — 2313 (94,6 %). «Астатнія аб'екты як цеплавога спажывання, так і генерацыі атрымаюць пашпарты ва ўстаноўленыя тэрміны. Рамонтныя работы скончаныя цалкам», — удакладніў Андрэй Шульга.

У Мінскай вобласці паралельна вядуцца работы па замене цеплавых сетак, якія выкананы на 85 %. Работу з сеткамі працягнуць і ў ацяпляльны перыяд. Зарэзерваваная падача цеплазабеспячэння перасоўнымі блочна-модульнымі кацельнямі (іх на тэрыторыі вобласці ў фондзе жыллёва-камунальнай гаспадаркі тры — у Маладзечанскім, Мінскім і Дзяржынскім раёнах). Таксама праводзілася замена сетак водазабеспячэння і водаадвядзення (выканана 71 % і 76 % ад плана).

Да зімы падрыхтаваны і дарогі. Для ўпэўненага ўтрымання вулічна-дарожнай сеткі ў зімовы перыяд будзе прыцягвацца 479 адзінак спецыяльнай тэхнікі. Нарыхтавана звыш 440 тысяч тон пясчана-салянай сумесі.

**Сяргей КУРКАЧ.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191 021 390, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | Унитарное предприятие «БелшинаТранс», Могилевская область, г. Бобруйск, Минское шоссе. УНП 790913853 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 1. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**
Месторасположение: г. Бобруйск, ул. Минское шоссе (территория ОАО «Белшина»)

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Грузовой седельный тягач MAZ-544069 320-031,** AI 7879-6, 2008 г. в. | **16 000,00** (снижена на 5 %) |
| 2 | **Машина универсальная «Беларус МУ-466»,** IB-6 2049, 2012 г. в. | **177 361,96** |
| 3 | **Автобус вагон MAZ 256170**, рег. № АВ4216-6, 2011 г. в. | **14 460,00** |
| 4 | **Грузовой специальный автокран MAZ-5337 KS-45729-4,** АВ6051-6, 2011 г. в. | **48 600,00** (снижена на 10 %) |
| 5 | **Машина погрузочная универсальная «Амкодор-37»,** IB-6 2039, 2012 г. в. | **21 500,00** (снижена на 10 %) |
| 6 | **Экскаватор ЕК-18-20**, ТА-6 3484, 2007 г. в. | **64 800,00** |

Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** в течение **30 (тридцати)** дней после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» **(www.ipmtorgi.by).** Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение от 1 % до 10 % от итоговой цены продажи в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения торгов. Подробная информация о проведении торгов размещена на сайте www.ipmtorgi.by

*Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» 21.08.2025*

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 10.10.2025.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 09.10.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (44) 704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by**



**Брестский филиал
РУП «Институт недвижимости и оценки»
ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ
ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

**Лот № 1:**
1) капитальное строение с инвентарным номером 111/С-8105 (наименование: свинарник (инв. № 642); назначение: Здание специализированное животноводства) площадью 1916,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ляховичский р-н, Гончаровский с/с, 24, 0,2 км юго-западнее д. Миничи, на земельном участке с кадастровым номером 125080700001000087 площадью 2,1933 га;
2) капитальное строение с инвентарным номером 111/С-8106 (наименование: свинарник (инв. № 643); назначение: Здание специализированное животноводства) площадью 1307,8 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ляховичский р-н, Гончаровский с/с, 24/1, 0,2 км юго-западнее д. Миничи, на земельном участке с кадастровым номером 125080700001000087 площадью 2,1933 га

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена, руб. (без учета НДС)** | **59 300,00** | **Размер задатка, руб.** | **5 930,00** |

**Продавец:** ОАО «Жеребковичи», 225390, Брестская обл., Ляховичский р-н, аг. Жеребковичи, тел. 80163345223.
**Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701.
Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901.
**Условия продажи:** без условий.
**Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.
**Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи.
**Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона.
**Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 28 октября 2025 г. в 14.00
по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** также можно узнать по телефонам: **8 (0162)-40-87-01, 40-87-41**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329, в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 27 октября 2025 г. до 17.00**

# ПЕРАМОГА ЗДАРОВАГА СЭНСУ

## Польшча адкрыла граніцу з Беларуссю

**Амаль два тыдні граніца з нашай заходняй суседкай была на замку з яе ініцыятывы пад надуманай падставай: нібыта пагроза ад сумесных вучэнняў Беларусі і Расіі «Захад-2025», якія, дарэчы, скончыліся 16 верасня. І вось у ноч на 25 верасня Польшча адкрыла сваю граніцу з Беларуссю. Пра ўсё, што адбывалася, — у нашым матэрыяле.**

Нагадаем, што польскія пагранічнікі ўначы, 12 верасня, закрылі свае пункты пропуску на беларуска-польскай граніцы. Пад замком апынуліся аўтадарожныя пункты «Брэст»—«Цярэспаль» і «Казловічы»—«Кукурыкі», а таксама чатыры чыгуначныя пункты пропуску: «Гродна»—«Кузніца Беластоцкая», «Бераставіца»—«Зубкі беластоцкія», «Свіслач»—«Сямёнаўка», «Брэст»—«Цярэспаль». Пра час аднаўлення іх працы польскі бок не паведамляў.

У Дзяржаўны пагранічны камітэт Беларусі пагранічная варта Польшчы 23 верасня даслала афіцыйнае апавяшчэнне аб адкрыцці 25 верасня з 1.00 па беларускім часе закрытых амаль два тыдні таму пунктаў пропуску. Так, тады на мосце перад прапускным пунктам «Брэст» польскія пагранічнікі збудавалі агароджу, выкарыстоўваючы бетонныя ўмацаванні, калючы дрот і металічныя шчыты. Днём, 24 верасня, польскія пагранічнікі згарнулі «калючку», пачалі прыбіраць цяжкія інжынерныя збудаванні, якія патрабуюць выкарыстання тэхнікі, пакінуўшы на мосце праз Буг толькі жалезныя шчыты. Да іх дэмантажу прыступілі бліжэй да гадзіны ночы 25 верасня (паводле беларускага часу), такім чынам адкрыўшы граніцу з Беларуссю.

Беларускія пагранічнікі ў 23 гадзіны 24 верасня пачалі запускаць транспарт на тэрыторыю пункта пропуску «Брэст». Пасля неабходных працэдур афармлення аўтобусы і легкавыя аўтамабілі праехалі на мост у чаканні ўезду на тэрыторыю Польшчы.

Афармляць на польскі бок аўтадарожны транспарт беларускія мытнікі пачалі з 23.00, выклікаць зарэгістраваныя ў электроннай чарзе грузавікі для прыбыцця ў пункт пропуску «Казловічы» — з 20.00.

— З 1.00 да 8.00 на выезд з нашай краіны праз пункт пропуску «Казловічы» польскія кантралюючыя службы прынялі 260 грузавікоў. Граніцу ў зваротным напрамку перасеклі 100 транспартных сродкаў. У пункце пропуску «Брэст» у агульнай складанасці польскі бок прыняў каля 550 легкавых аўтамабіляў, — адзначылі ў беларускім мытным ведамстве.

Дарэчы, беларуская мытня ўзмацніла змены ў пунктах пропуску на граніцы з Польшчай, якія аднавілі сваю працу.



Фота БелТА.

## «ЗАКРЫЦЦЁ ГРАНІЦЫ НЕ МЕЛА ЛАГІЧНАГА ПРАЦЯГУ З ПРЫЧЫНЫ ЯГО БЕСПЕРСПЕКТЫЎНАСЦІ»

Такім меркаваннем падзяліўся **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, начальнік Галоўнага фінансавага ўпраўлення Гродзенскага аблвыканкама Павел АШУРЫК.**

— Анансаванае афіцыйнымі асобамі Рэспублікі Польшча адкрыццё некаторых транспартных пунктаў пропуску дэманструе здольнасць польскім бокам адэкватна ацэньваць эфект ад узаемавыгаднага эканамічнага супрацоўніцтва, — адзначыў парламентарый.

Ён нагадаў, што раней агучанае рашэнне суседзяў аб часовым закрыцці пунктаў выклікала абгрунтаванае здзіўленне не толькі ў Беларусі, але і ў многіх краінах свету:

— Наша краіна неаднаразова адкрыта заяўляла і на справе дэманстравала міралюбную добрасуседскую палітыку з многімі краінамі, а ў першую чаргу — з краінамі-суседкамі. Часовае так званае «закрыццё мяжы» відавочна не мела лагічнага працягу з прычыны яго эканамічнай немэтазгоднасці і бесперспектыўнасці.

На яго думку, цвярозая ацэнка сітуацыі з таго боку прывяла да ўзаемнага пазітыўнага рашэння аднавіць некаторыя транспартныя зносіны паміж нашымі краінамі і іншымі гандлёвымі краінамі-партнёрамі.

— Нават пры тым, што, як вядома, суседзяў не выбіраюць, нашы краіны гістарычна звязваюць агульная гісторыя, родная сувязі простых людзей. Уяўляецца, што ў нашых краін ёсць патэнцыял знаходзіць пункты судакранання і супрацоўніцтва ў розных сферах для ўзаемнага добрасуседства, — падкрэсліў сенатар.

* * *

**Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы Руслан ШКОДЗІН** так пракаментаваў падзею з адкрыццём граніцы:

— Граніцу, натуральна, адкрылі. Адзінае — нанеслі шкоду бізнесу, людзям (палякам, беларусам, грамадзянам іншых краін). Пра палякаў — малайцы, не вераць у хлусню. Пастаянна палякам хлусяць: наконт мігрантаў, наконт беспілотнікаў, наконт разбуранага дома. На сусветнай арэне спрабавалі паказаць фатаграфію, хлусяць. Давядзіцца спадзявацца на мудрасць польскага народа. Ад палітыкаў, ад урада такой мудрасці ў найбліжэйшы час няма. А Рэспубліка Беларусь не мела і не будзе (мець. — **Заўв. аўт.**) агрэсіўных намераў.

## «ПОЛЬСКІЯ ЎЛАДЫ РАЗУМЕЛІ, ШТО ЗРАБІЛІ ПАМЫЛКУ»

### Томаш Шміт — пра закрыццё граніцы з Беларуссю

Польскія ўлады разумелі, што здзейснілі памылку, калі закрылі граніцу з Беларуссю. Такім меркаваннем польскі экс-суддзя Томаш Шміт падзяліўся з журналістамі пасля адкрыцця граніцы.

— Я вельмі рады, што адкрыта граніца, бо польскія ўлады разумелі, што зрабілі памылку. Паглядзім, як сітуацыя будзе развівацца далей. Людзям у Польшчы надакучыла, што закрытыя граніцы з Беларуссю, у тым ліку ўсе пераходы ў раёне Падляшша і Беластока. Многія бізнесы сур'ёзна пацярпелі праз такія пастановы польскай улады, — сказаў Томаш Шміт.

Паводле яго слоў, закрыццё граніцы мела негатыўны эканамічны эфект для Польшчы, бо праз яе праходзіць чыгуначны маршрут паміж Кітаем і Еўрасаюзам. Акрамя таго, цяпер Кітай будзе глядзець, наколькі можна давяраць польскім уладам.

— Рашэнне было, шчыра сказаць, не самае разумнае, — падкрэсліў Томаш Шміт, адзначыўшы: калі б абмежаванні працягнуліся, Кітай мог бы адмовіцца ад супрацоўніцтва з Польшчай, што прывяло б да выгады для порта Гамбурга і ўсёй Германіі.

